Шаўчук І.І., доктар гістарычных навук, БрДУ,
Карзенка Г.У., доктар гістарычных навк, БДПУ

# З ВОПЫТУ АРГАНІЗАЦЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ НАВУКІ Ў БССР

Суадносіны ступені ўплыву і прысутнасці нацыянальнага і інтэрнацыянальнага кампанентаў ў працэссе навуковай творчасці і яе выніках, у сённяшнім навуказанўстве з'яўляюцца дыскусійнымі. Тым не менш, роля гэтых фактараў у зазначанай сферы сацыяльнай дзейнасці спецыялістамі прызнаецца відавочнай. Мы не ставім зараз на мэце працягнуць абмеркаванне тэарэтычных аспектаў акрэсленага пытання. Таму, пры раскрыцці тэмы, будзем зыходзіць з таго пастулата, што навука, якая "робіцца" ёсць нацыянальная, а навука "зробленая" – інтэрнацыянальная.

У гэтай сувязі асаблівы інтарэс мае паўторная інстытуалізацыя навукі ў Беларусі ў 1920–1930-х гадах, паколькі, пасля знішчэння гэтага сацыяльнага інстытуту Расіяй у XIX ст., ён не меў філіяцыйнай кампаненты. Падчас вывучэння зазначанага пытання ва ўмовах тагачаснай нацыянальнай савецкай рэспублікі, мае самастойнае значэнне нацыянальны аспект гэтага працэсу. Пры згадванні яго, перш за ўсё справядліва на першы план выходзіць стварэнне менавіта беларускай навукі. Аднак, за выключэннем дадзенага чынніка, прысутнічалі і іншыя: яўрэйскі, польскі, расійскі і г.д. Сацыяльныя і палітычныя умовы абумовілі сітуацыю, калі мы не можам казаць пра ўласна беларускую навуку, як працэсс нацыянальна афарбаванага спосабу здабыцця новых ведаў, кшталту "нямецкая філасофія", альбо "англійская палітэканомія". Дарэчы, У.І. Пічэта ў красавіку 1925 г. зазначаў: "Наша прафесура – гэта прышэльцы. Нам трэба стварыць сваю прафесуру ..." [7, арк. 19 адв.]. Хутчэй за ўсё паняцце "беларуская навука" мела, асабліва з канца 1920-х гадоў, і перадусім яе гуманітарны і сацыяльны сектары, выключна геаграфічнае, а не сутнаснае этнічнае гучанне. Галоўным чынам

сказанае пацвярджаецца кадравым складам вучоных рэспублікі. Асабліва на этапе станаўлення сацыяльнага інстытуту навукі ў акрэслены час. Гэтаксама, неабходна ўлічваць нацыянальна самаўсведамленне, менталітэт тых дзеячоў, якія паводле паходжання лічыліся беларусамі, і якіх сучасная гістарыяграфія схематычна залічвае да “беларускіх дзеячаў”, нягледзячы на тое, што іх свядомасць не сягала далей узроўню “западноруссизма”: Я.Ф. Карскі, Я.В. Воўк-Левановіч і інш. Да таго, звернем увагу, што згадваючы першыя годы існавання БДУ да яго 10-годдзя У.І. Пічэта канстатаваў: “Праўленьне БДзУ імкнулася да таго, каб запрасіць да працы ў БДзУ праф. беларусоў, якія працавалі ў інш. навуч. установах. Аднак … не адзін з праф. беларусаў ня даў сваёй згоды на працу ў БДУ” [2, с. 25]. Характарызуючы Я.Ф. Карскага як “беларускага дзеяча”, не трэба забывацца на словы Я.Ю. Лёсіка, прамоўленыя на паседжанні адной з прадметных камісій універсітэта ў лютым 1924 г.: “... Карскі, пры ўсёй яго вучонасці, да беларускага руху ставіцца варожа” [8, арк. 23]. Пічэта ў сваю чаргу (1939 г.): “Для Карскага Беларусь – гэта толькі Заходняя Расія ... [10, арк. 5]. Такім чынам, абсалютна розныя навукоўцы, аднолькава характарызавалі пазіцыю акадэміка. Тая самая сітуацыя прасочваецца і ў выпадку вучня і маладзейшага калегі Я.Ф. Карскага Я.В. Воўк-Левановіча. Так, у кастрычніку 1929 г. старэйшы ўпаўнаважаны АДПУ Сікорскі зазначаў: “Вялікадзяржаўныя шавіністычныя ўстаноўкі Воўк-Левановіча, наведванне ім Карскага мне былі вядомыя…” [13, арк. 36]. Праз два месяцы, пасля прачытання 16 снежня 1929 г. Я.В. Воўк-Левановічам даклада “Пра некаторыя важнейшыя недахопы беларускай літаратуры” у БАН, У.М. Ігнатоўскі прапанаваў яму пакінуць Беларусь і ўніверсітэт [13, арк. 46].

І апошні штрых, які характарызуе ўнутрынавуковую сітуацыю, дакладней перманентнае супрацьстаянне беларускіх і небеларускіх, галоўным чынам яўрэйскіх і расійскіх прадстаўнікоў навукі. Толькі два прыклады. Так, камуністычная фракцыя праўлення БДУ фіксавала ў кастрычніку 1926 г.: “Пераважалі русіфікатарскія настроі, якія абапіраліся на пераважна рускі склад навуковых работнікаў сярод прафесуры”. Спробы больш актыўнага ажыццяўлення беларусізацыі

выклікалі, як адзначалася ў цытаваным вышэй дакуменце, арганізаваны сумесны адпор з боку рускіх і яўрэйскіх навуковых работнікаў [11, арк. 348]. У 1929 г. камісія ЦКК ВКП(б) для абследавання практыкі правядзення нацыянальнай палітыкі пад кіраўніцтвам У.П.Затонскага адзначала варожасць да ўсяго беларускага з боку яўрэйскіх навуковых работнікаў – да карэнізацыі навукоўцаў, незадаволенасць "недастатковым" камплектаваннем Акадэміі навук яўрэямі і г.д. [12, арк. 13–14]. Зыходзячы з канкрэтна-гістарычных умоваў арганізацыйнага развіцця навукі, мусім улічваць тыя фактары. А ў дадзеным выпадку менавіта на нацыянальныя і звернем увагу.

Такі падыход апраўданы, нягледзячы на вялікую колькасць згадак пра нацыянальныя навуковыя падраздзяленні, паколькі да сённяшняга дня яны не атрымалі, на нашу думку, належнай аргументаванай прысутнасці ў айчыннай гістарыяграфіі. Нявывераныя нават факты, якія дастаткова проста верыфікуюцца. Фактычна можам вылучыць толькі некалькі спецыяльных публікацый І.П. Герасімавай [5], М.У. Токарава [18] і Д.Л. Шавялёва [25], а таксама неаргументаваныя асобныя згадкі ў іншых працах М.У. Токарава [19] і П.Ц. Петрыкава [17]. Закранаалася праблема і ў публікацыях аўтараў гэтага матэрыялу [23; 24], аднак ніякай рэакцыі ў беларускіх навуковых колах прадстаўленыя вынікі даследаванняў не выклікалі. Яны папросту засталіся незаўважанымі.

Зразумела, у межах вызначанага аб'ёму немагчыма здзейсніць асвятленне ўсіх момантаў, што гэтага патрабуюць. Таму тэзісна звернемя да тых, якія ўяўляюцца недастаткова высветленымі і дыскусійнымі. Такімі, напрыклад, мы лічым, стварэнне Інстытута яўрэйскай культуры, час стварэння Інстытутаў яўрэйскай і польскай пралетарскіх культур (ІЯПК, ІППК), спосабы асвятлення навукоўцамі некаторых, быццам бы вядомых нацыянальных арганізацыйных формаў навукі ў Беларусі, асобы кіраўнікоў нацыянальных інстытутаў, матывацыю стварэння нацыянальных навуковых падраздзяленняў.

*Стварэнне Інстытута яўрэйскай культуры.* І.П. Герасімава, П.Ц. Петрыкаў, М.У. Токараў сцвярджаюць пра

яго ініцыяванне “яўрэйскімі коламі”, пра актыўную працу яўрэйскай камісіі у 1921 г. і пазней. У якасці доказа неслушнасці іх пазіцыі працытуем адзін дакумент. Гэта службовая запіска намесніка кіраўніка Акадэмцэнтра С.М. Некрашэвіча Наркаму асветы У.М. Ігнатоўскаму, напісаная ў снежні 1921 г. У ёй звяртаецца ўвага: “Ак[адэмічны] Цэнтр прымае ўсе магчымыя меры да стварэння пры Ак[адэмічным] Цэнтры яўрэйскага культурнага ядра, і калі яно яшчэ да гэтага часу не створана, то віна ў гэтым амаль выключна падае на т. Франкфурта, як кіраўніка Еўбюро і члена Калегіі Ак[адэмічнага] Цэнтра. За ўвесь шасцімесячны перыяд існавання Ак[адэмічнага] Цэнтра ад т. Франкфурта не паступіла ніводнай канкрэтнай прапановы аб яўрэйскай культурна-навуковай працы пры АЦ. Гэтая культурна-навуковая праца магла выяўляцца ў двух напрамках − у стварэнні Яўрэйскага Акадэмічнага Тэатра і Інстытута яўрэйскай культуры. Першае пытанне ажыццёўлена, толькі [не з] ініцыятывы т. Франкфурта і Яўтрупа пры Актэатры існуе. Што ж тычыцца другога пытання − стварэння Інстытута яўкультуры, то да гэтага пытання Яўбюро паставілася цалкам індыферэнтна, а між тым ініцыятыва па арганізацыі гэтай установы, як спецыяльна-яўрэйскай, можа зыходзіць толькі ад Яўбюро. Акадэмічным Цэнтрам з свайго боку былі прадстаўлены ўсе магчымасці: 1) заснавана была спецыяльная пасада па распрацоўцы пытання аб Інстытуце яўкультуры; 2) у заяўцы ад 31 кастрычніка г.г. ... зроблены запыт на 30 пайкоў для названай ўстановы. Не магу не згадаць пра яўрэйскую камісію па вывучэнні старажытнасцяў, якая існавала да кастрычніка м-ца пры Аддзеле аховы помнікаў даўніны. ... у кастрычніку м-цы было прапанавана ўсім падведамным установам прадставіць даклады аб іх працы. Зыходзячы з таго, што прадстаўлены даклад аддз[ел] аховы помнікаў даўніны быў прызнаны нездавальняючым, гэты Аддзел быў расфармаваны, а яўр[эйская] камісія па вывучэнні старажытнасцяў, якая не прадставіла ніякіх дакладаў аб сваёй працы, была прылічана да таварыстваў, што субсідуюцца па меры іх сапраўднай працы. Прыблізна праз паўтара м-ца да мяне звярнуўся т. Франкфурт з прэтэнзіяй, што Камісія аднесена да таварыстваў. Мною было паказана, што гэта прынятае Вамі і т. Кацэнбогінам; аднак,

мною тут жа было заяўлена, што калі т. Франкфурт лічыць, што камісія сапраўды працавала, а не толькі лічылася на паперы (у чым можна пераканацца з таго, што Камісія толькі праз $1^1/_2$ месяцы даведалася пра сваё перайменаванне), то пад яго, Франкфурта адказнасць, Ак[адэмічны] Цэнтр можа залічыць іх на службу і знайсці такім чынам спосаб кампенсаваць іх працу. Па ўсёй бачнасці, т. Франкфурт у прынцыпе быў згодны з Ак[адэмічным] Цэнтрам, таму ў выглядзе кампенсацыі за працы Камісіі прапанаваў аднаго з былых членаў т. Рабіновіча залічыць на паёк. У адказ на гэта А.Ц. было ўказана, што паёк выдаецца толькі тым, хто афіцыйна працуе, а таму прапаноўвалася ўказаць, на якую пасаду Яўбюро прапануе т. Рабіновіча, але адказу на гэтую прапанову не было” [9, арк. 28−30 адв.].

*Час стварэння Інстытутаў яўрэйскай і польскай пралетарскіх культур.* Стварэнне і існаванне гэтых інстытутаў не было таямніцай для гістарыяграфіі, паколькі зафіксавана ў статуце БАН, і ў іншых афіцыйных дакументах. Тым не менш, год пачатку іх існавання чамусьці выклікае розныя хібныя меркаванні. Напрыклад, у “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі” выказана памылковая думка пра пачатак існавання польскага інстытута з 1931 г. (адпаведны яўрэйскі інстытут энцыклапедыя не згадвае ўвогуле) [1]. Тое самае назіраецца і з яўрэйскім: “… Інстытут яўрэйскай пралетарскай культуры быў створаны ў 1933 г., а не ў 1932 г., як меркавалася раней”, – піша Д.Л. Шавялёў [25]. Між іншым, у акадэмічным архіве захаваўся арыгінал пастановы Прэзідыуму БАН аб арганізацыі двух Інстытутаў − яўрэйскай і польскай пралетарскіх культур, пазначаны 25 кастрычнікам 1932 г. [20, арк. 90]. Гэтую ж дату канстатавала ў 1996 г. І.П. Герасімава. Дарэчы, у 1934 г. І.Ф. Шпілеўскі стварэнне адпаведных устаноў датаваў тым самым днём [26, с. 98, 100].

*Іншыя нацыянальныя арганізацыйныя формы навукі*. За выключэннем зазначаных інстытутаў, у структуры БАН адпаведна чэрвеньскай (1933 г.) пастановы СНК БССР “Пра сетку навукова-даследчых устаноў БССР” арганізаваны Інстытут пралетарскай культуры літоўскай, латышскай і іншых народнасцяў БССР, у які аб’ядноўваліся літоўскі і латышскі

сектары Акадэміі навук [14, арк. 10, 12; 19, с. 38]). У 1935 г. усе нацыянальныя інстытута былі аб'яднаныя ў адзін Інстытут нацыянальных меншасцяў. Гэтыя факты з'яўляюцца хрэстаматыйнымі. Але і тут прысутнічае блытаніна, якую тсвараюць быццам бы дасведчаныя даследчыкі. Напрыклад, прадстаўлена яна ў акадэмічным выданні [15, с. 180], у энцыклапедычным артыкуле М.В. Біч сцвярджаў, што С.Х. Агурскі з 1934 г. займаў пасаду дырэктара ІНМ, а М.У. Токараў – намесніка дырэктара [3, с. 42; 4, с. 16], чаго, зразумела быць не магло. С.Х. Агурскі насамрэч займаў пасаду намесніка дырэктара ІНМ, але толькі ў кароткі перыяд яго існавання з 1935 г. па 1936 г., а перад тым – дырэктара ІЯПК.

*Кіраўнікі нацыянальных інстытутаў БАН*. І гэтае пытанне не раскрыта даследчыкамі. Што тычыцца кіраўнікоў яўрэйскага інстытуту, то, як можна меркаваць, першым дырэктарам стаў І. Ашаровіч, але займаў пасаду чатыры дні, а 29 кастрычніка выконваючым яго абавязкі быў прызначаны І. Гершенбаўм [20, арк. 90]. Гэта канстатуе і пастанова Прэзідыуму ад 21 лютага 1933 г. аб праверцы работнікаў БАН [21, арк. 9]. У тым жа годзе 3 ліпеня дырэктарам стаў С.Х. Агурскі [21, арк. 62]. Такім чынам, ён заняў пасаду ў 1933 г. Адносна кіраўніцтва польскага інстытута В.А. Астрогам у энцыклапедычным артыкуле выказана недакладнасць, калі ён называе дырэктарам Я.А. Віткоўскага ў 1931–1935 гг. [1] Яшчэ У.М. Міхнюк канстатаваў зняцце яго з пасады ў 1933 г. [6]. Сапраўды, 7 жніўня 1933 г. Прэзідыум БАН прызначыў в.а. дырэктара Ф.П. Зарэмбскага, а 4 верасня пастанавіў зняць з пасады дырэктара і ўвогуле з працы ў Акадэміі з 1 верасня Я.А. Віткоўскага. 19 верасня Прэзідыумам Ф.П. Зарэмбскі быў зацверджаны намеснікам дырэктара, а дырэктарам – Т.Ф. Домбаль [21, арк. 66, 71, 73]. У гэтай якасці апошні выступаў пры падрыхтоўцы справаздачы БАН XI з'езду саветаў БССР (1934 г.) [22, арк. 14–15]. Т.Ф. Домбаль заставаўся дырэктарам да ліквідацыі асобнага Інстытута польскай пралетарскай культуры ў 1935 г.

*Матывацыя стварэння нацыянальных навуковых падраздзяленняў* у айчыннай навуцы прадстаўлена адназначна як вынік правільнай нацыянальнай палітыкі, адмоўныя змены ў

якой з сярэдзіны 1930-х гадоў прывялі да закрыцця згаданых нацыянальных навуковых устаноў. Такая пазіцыя нам ўяўляецца сумніўнай. Думаецца, што такога кшталту арганізацыйныя мерапрыемствы, калі пакінуць па-за полем зроку палітыку, ды і каляпалітычныя пытанні, не былі патрэбныя для даследавання гісторыі і культуры яўрэяў (8,2% у складзе насельніцтва БССР), палякаў (2%), латышоў (0,3%), літоўцаў (0,1%). Тое, што не навука, а палітыка стала грунтам стварэння падобных структур, сведчыць факт іх адсутнасці ў рускіх (7,7%) і украінцаў (0,7%). Гэтага ніхто з арганізатараў і сучаснікаў тых падзей не хаваў. “Стварэнне самастойных нацыянальных інстытутаў мае вялікае палітычнае значэнне”, − пісаў неадменны сакратар БАН П.Я. Панкевіч [16, с. 108]. Тое ж адзначалася і ў справаздачы БАН XI з’езду Саветаў БССР (1934 г.): “Стварэнне самастойных нацыянальных інстытутаў у сістэме Акадэміі навук мае вялікае палітычнае значэнне ў сэнсе вырашэння важнейшых пытанняў ленінскай нацыянальнай палітыкі” [22, арк. 4].

Вывучэнне праблемы дазваляе таксама сцвярджаць, што ініцыятарамі арганізацыі самастойнай яўрэйскай навукова-даследчай працы выступілі не яўрэі, палякі, латышы, літоўцы а беларусы. Прычыну гэтага я бачу ў імкненні прадстаўнікоў беларускай палітычнай і навуковай эліты пабудаваць нацыянальную рэспубліку ў савецкай форме, завяршыць працэс нацыятварэння. Адсюль планавалася вывесці найбольш моцных актыўных канкурэнтаў, пераважна лепш за карэнны этнас адукаваных гараджанаў, па-за беларускі кантэкст у галіне культурнага і навуковага будаўніцтва. Пазней навукова-арганізацыйныя працэсы лагічна абумоўліваліся зменамі ў нацыянальнай палітыцы, вызначанымі палітычнай і эканамічнай сітуацыяй.

Спіс літаратуры і крыніц.

1. Астрога, В. Інстытут польскай пралетарскай культуры / В. Астрога // Энцыкл. гіст. Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1996. – Т. 3. – С. 496.

2. Беларускі Дзяржаўны Універсітэт да 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі. – Мінск, 1927. – 76 с.

3. Біч, М.В. Агурскі Самуіл Хаімавіч / М.В. Біч // Энцыкл. гіст. Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1999. – Т. 1. – С. 42.

4. Возвращённые имена: Сотрудники АН Беларуси, пострадавшие в период сталинских репрессий / сост. и авт. предисл. Н.В. Токарев ; под ред. А.С. Махнача. – Минск : Наука и техника, 1992. – 120 с.

5. Герасимова, И. К истории еврейского отдела Института беларускай культуры (Инбелкульта) и еврейского сектора Белорусской академии наук в 20−30- годах / И. Герасимова // Вестник еврейского университета в Москве. − 1996. − № 2. − С. 144−167.

6. Міхнюк, У. Віткоўскі І.А. / У. Міхнюк // Энцыкл. гіст. Беларусі : ў 6 т. – Мінск, 1994. – Т. 2. –С. 308.

7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 4-п. – Воп. 1. – Спр. 2323. Протоколы заседаний правления Комвуза БССР, фракции КП(б)Б Белгосуниверситета, 3-й Всебелорусской конференции пролетарского студенчества, документы к ним. 17 июля 1925 г. – 3 декабря 1926 г.

8. НАРБ. Ф. 205. – Воп. 1. – Спр. 781. Протоколы заседаний деканата, советов отделений и предметных комиссий [педагогического] факультета. 16 декабря 1923 г. – 26 декабря 1924 г.

9. НАРБ. Ф. 42. – Воп. 1. – Спр. 519. Отчёт о работе за 1921 г., смета расходов на 1922 г. и штатное расписание академического центра БССР, отчёты о работе научно-литературного отдела Наркомпроса БССР, Белорусского государственного академического театра и оперно-драматической студии в гор. Москве. 31 августа 1921 г. – 12 января 1922 г.

10. НАРБ. Ф. 4-п. – Воп. 1. – Спр. 14635. Копия докладной записки члена-корреспондента Академии наук СССР В.И. Пичеты в ЦК ВКП(б) от 18 ноября 1939 г. о разграничении областей и районов между БССР и УССР, стратегическая карта средней Европы с нанесением территории, заселённой белорусами [1939 г.].

11. НАРБ. Ф. 4-п. – Воп. 1. – Спр. 2310. Протоколы заседаний коллегии агитационно-пропагандистского отдела ЦК КП(б)Б, комиссий при отделе, еврейского бюро и пленума

латышского бюро ЦК КП(б)Б, документы к протоколам. 21 сентября 1925 г. – 10 декабря 1926 г.

12. НАРБ. Ф. 4-п. – Воп. 1. – Спр. 4182. [Короткие справки] о политико-просветительной работе, ликвидации неграмотности, развитии белорусской художественной литературы и др., сведения о составе и численности аспирантов БССР на 5 апреля 1929 г. 26 мая 1928 г. – 28 мая 1929 г.

13. НАРБ. Ф. 4-п. – Воп. 1.– Спр. 4720. Докладные записки ГПУ БССР о настроениях национал-демократических кругов г. Минска, наличии кулацких элементов в отдельных районах БССР, искривлении классовой линии партии при обложении и взыскании сельскохозяйственного налога с кулацких хозяйств, состоянии немецких колоний Мозырского окр. и др. 26 апреля 1929 г. – 31 мая 1931 г.

14. НАРБ. Ф. 60. – Воп. 1. – Спр. 161. Постановления СНК БССР о сети научно-исследовательских учреждений и подготовке аспирантов. 10.02.–7.06.1933.

15. Национальная Академия наук Беларуси. Персональный состав. 1928–2008 / сост.: О.А. Гапоненко [и др.] ; редкол.: Н.А. Борисевич [и др.]. – 4-е изд., доп. и перераб. – Минск : Белорус. наука, 2008. – 376 с.

16. Панкевич, П. Белорусская Академия наук за пять лет / П. Панкевич // Фронт науки и техники. − 1934. − № 3. − С. 107−112.

17. Петрыкаў, П.Ц. Інстытуту беларускай культуры – 70 гадоў / П.Ц. Петрыкаў // Весці АН РБ. – Сер. гуманітар. навук. – 1992. – № 5–6. – С. 52–70.

18. Токараў, М. Вывучэнне культуры і гісторыі яўрэяў у Беларускай акадэміі навук / М. Токараў // Беларусіка=Albaruthenica. – Мінск, 1995. – Кн. 4. – С. 133–136.

19. Токарев, Н.В. Академия наук Белорусской ССР: годы становления и испытаний (1929–1945) / Н.В. Токарев ; под ред. В.А. Полуяна. – Минск : Наука и техника, 1988. – 182 с.

20. Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі (ЦНА НАНБ). Ф. 1. – Спр. 16а. Протоколы заседаний Президиума АН БССР и выписки из протоколов (1932 г.).

21. ЦНА НАНБ. Ф. 1. – Спр. 21а. Стенограммы заседаний Президиума и другая переписка, протоколы заседания Президиума АН БССР (1933 г.).

22. ЦНА НАНБ. Ф. 1. – Спр. 29. Отчёт АН БССР к XI съезду Советов БССР (1934 г.).

23. Шаўчук, І.І. Гуманітарныя навукі ў сацыяльнай гісторыі Беларусі (20–30-я гады XX ст.) / І.І. Шаўчук. – Брэст : БрДУ, 2007. – 279 с.

24. Шаўчук, І.І. Спроба стварэння Інстытута яўрэйскай культуры / І.І. Шаўчук, Г.У. Карзенка // Этнічная, моўная і культурная разнастайнасць у сучасным грамадстве : 29−30 мая 2014 г., г. Магілёў ; уклад. І.А. Пушкін, рэдкал. Ю.М. Бубнаў (адк. рэд.) [і інш.]. − Магілёў : МДУХ, 2014. − С. 318−323.

25. Шевелев, Д. Еврейские исследования в Белорусской ССР в 1933−1941 гг. (по документам Центрального научного архива Национальной академии наук Беларуси) / Д. Шевелев // Мат. Шестнадцатой ежегод. Междунар. междисциплинар. конф. по иудаике. Ч. 2. Вып. 26. М., 2009 [Электроны рэсурс]. − Рэжым доступу : http://www.libed.ru/konferencii-raznoe/356073-13-moscow-center-for-university-teaching-jewish-civilization-sefer-proceedings-the-sixteenth-annual-internati.php. – Дата доступу : 01.06.2014.

26. Шпілеўскі, І.Ф. Беларуская Акадэмія навук да XV-годдзя БССР / І.Ф. Шпілеўскі. – Менск : Выд-ва БАН, 1934. – 144 с.

Этноконфессиональные процессы в истории Беларуси. Сборник научных статей по итогам Республиканской научно-теоретической конференции (Минск, 12 декабря 2016 г.). – Минск: БНТУ, 2016. – С. 205–2014.